# Весці

**Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта імя Максіма Танка**

**№ 3 (33) 2002**

**Штоквартальны навукова-метадычны часопіс**
**Выдаецца з чэрвеня 1994 г.**

## Змест

***Галоўны рэдактар:***
Л. Н. Ціханаў

***Рэдакцыйная калегія:***
Н. Г. Алоўнікава
Г. А. Баўтута
В. А. Бондар (*нам. галоўнага рэдактара*)
Ю. А. Быкадораў (*нам. галоўнага рэдактара*)
А. М. Вітчанка
К. У. Гаўрылавец
А. А. Гіруцкі
Т. А. Грыгор'ева
Я. Л. Каламінскі
Л. А. Кандыбовіч
Н. І. Копысава (*адказны сакратар*)
Г. А. Космач
І. А. Новік
А. У. Рагуля
М. Т. Стэльмашук
В. М. Фамін
А. Т. Федарук
І. І. Цыркун
Л. Б. Шнеперман
У. А. Якавенка
М. С. Яўневіч

***Адрас рэдакцыі:***
220007, Мінск,
вул. Магілёўская, 37,
пакой 124,
тэл. 219-78-12

*Педагогіка*

*Саўчанка Н. В.* Асаблівасці арганізацыі педагагічнай камунікацыі з вучнямі пачатковай школы .......... 3
*Казінец Л. А.* Удасканаленне арганізацыйных форм самастойнай працы студэнтаў .......... 12
*Любімава Ю. С.* Шляхі ўдасканалення падрыхтоўкі студэнтаў да эстэтычнага выхавання малодшых школьнікаў .......... 16
*Страха А. А.* Замежныя педагогі мінулага аб ролі гульняў дашкольнікаў з прыроднымі матэрыяламі .......... 21
*Тавгень И. А.* Дистанционное образование в информационном обществе: перспективы развития .......... 27
*Андарала І. А.* Сацыякультурныя і эканамічныя прадпасылкі развіцця педагагічнай адукацыі ў Беларусі ў пачатку XX ст. .......... 34
*Анатольева Н. С.* Рэтраспектыўны аналіз распрацоўкі праблемы выхавання культуры міжнацыянальных адносін вучонымі-педагогамі .......... 41
*Нассер К. И.* Образовательная политика Турецкой империи в Ливане в XX в. (1516—1916 гг.) .......... 46
*Нассер К. И.* Развитие образования в Ливане в 20—40-е гг. XX в. .......... 52

*Псіхалогія*

*Джыга Н. Дз.* Фарміраванне прафесійнай прыгоднасці будучых педагогаў як сістэма .......... 58
*Паплаўскі М. М.* Уплыў каштоўнасцяў прафесіі і будучага спосабу жыцця на прафесійнае самавызначэнне навучэнцаў .......... 66
*Герасімовіч В. І.* Псіхалагічная дапамога агрэсіўнаму падлетку: праграма псіхакарэкцыі агрэсіўнасці .......... 73
*Краўчанка М. У.* Асаблівасці развіцця і праяўлення настойлівасці ў дзяцей малодшага школьнага ўзросту .......... 85
*Анціпава Н. Я.* Мадэль мастацкай свядомасці асобы .......... 92
*Киселева Н. В.* Особенности стрессоустойчивости и выбор факторов стресса в подростковом возрасте .......... 100
*Камкова А. І.* Сацыяльная культура і асоба .......... 108

*Дэфекталогія*

*Фяклістава С. М.* Фарміраванне гатоўнасці пераходу да сюжэтна-ролевай гульні ў дзяцей малодшага дашкольнага ўзросту з парушэннямі слыху .......... 113
*Мамонько О. В., Обухова Т. И.* Педагогические условия формирования коммуникативных умений у старших дошкольников с интеллектуальной недостаточностью в процессе двигательной деятельности .......... 120
*Гируцкий И. А.* Синтагматические и парадигматические словесные ассоциации у детей с первичной интеллектуальной недостаточностью .......... 126

*Мовазнаўства*

*Лемяза А. І.* Пераказ у сістэме развіцця маўлення вучняў .......... 139
*Трофимович Т. Г.* О теоретических основах типологии предметной номинации в языке старорусской деловой письменности .......... 142
*Бубен Т. Л.* Экзистенция и метафора (экзистенциальные преобразования полисемантов с первичным значением «водное пространство») .......... 149

# ГІСТОРЫЯ

УДК 37(09)(476)

*М. М. Сакалоў*

## ГРАМАДСКІЯ АРГАНІЗАЦЫІ СТУДЭНЦТВА БЕЛАРУСІ 1920-Х ГГ.

Па меры фарміравання складу студэнцтва Беларусі разгортвалася і яго грамадскае жыццё. Студэнцтва не ўяўляла сябе ў баку ад тых сацыяльных і культурных працэсаў, што працякалі ў жыцці грамадства. Акрамя таго, грамадская актыўнасць выступала натуральнай патрэбай студэнцкай моладзі, якая імкнулася найбольш поўна рэалізаваць свой духоўны патэнцыял, вырашаць надзённыя пытанні свайго жыцця, выражаць свае адносіны да з'яў і працэсаў, што адбываліся ў грамадстве.

Грамадская сфера жыцця і дзейнасці студэнцтва ўключала стварэнне і развіццё грамадскіх арганізацый, фарміраванне адпаведных органаў, разгортванне практычнай дзейнасці па задавальненні матэрыяльных, культурных і іншых запытаў студэнцтва. Паступова ў студэнцкім асяроддзі фарміраваліся палітычныя структуры (партыйныя арганізацыі КП(б)Б, арганізацыі камсамола), якія імкнуліся стаць на чале ўсіх грамадскіх арганізацый, уплываць на ўсё грамадскае жыццё. З другой паловы 20-х гг. праца грамадскіх арганізацый студэнцтва набывае яшчэ большую палітычную скіраванасць, адбываецца фактычнае аб'яднанне грамадскага і палітычнага жыцця, што разглядалася кампартыяй як спосаб дасягнення ўласных палітычных мэт у працы з моладдзю.

Дзяржаўныя органы, стварыўшыя сістэму вышэйшай адукацыі ў рэспубліцы ў пачатку 20-х гг., разумелі, што без удзелу студэнтаў немагчыма паспяхова вырашаць пытанні жыцця і дзейнасці навучальных устаноў. Менавіта таму прадстаўніцтва студэнцтва прадугледжвалася ўжо пры стварэнні адміністрацыйных органаў ВНУ. Загадам Наркамата асветы БССР № 39 ад [illegible] ліпеня 1921 г. было назначана Праўленне Беларускага дзяржаўнага універсітэта на чале з рэктарам У. І. Пічэтам у складзе [illegible] чалавек. Адно месца прызначалася для прадстаўніка ад студэнтаў, якое заставалася вакантным [1].

Удзел студэнцтва ў органах кіраўніцтва прадугледжваўся і ў Палажэнні аб вышэйшых навучальных установах, прынятым

у 1922 г., у прыватнасці ў артыкуле 30, вызначыўшым пар
фарміравання Савета і Праўлення кожнай ВНУ. Дадзеная
была станоўча ацэнена на пасяджэнні Савета БДУ, якое ад
ся 10 снежня 1922 г. [2]. Прадстаўнікі ад студэнцтва, выбр
на агульных сходах, уваходзілі ў склад Саветаў і Прэзіды
факультэтаў. Для садзеяння паспяховай арганізацыі вуч
працэсу, удасканалення форм і метадаў выкладання мерка
ўдзел прадстаўнікоў ад студэнцкага асяроддзя і ў Прадме
камісіях, куды ўваходзілі ўсе навуковыя работнікі адпаве
дысцыплін, прычым колькасць студэнтаў павінна была скла
у такіх камісіях палову ад колькасці выкладчыкаў [3].
больш масавымі студэнцкімі грамадскімі арганізацыямі на
цягу 20-х гг. з'яўляліся прафесійныя саюзы, што дзейні
ў ВНУ. Прафсаюзныя арганізацыі ў гады, разглядаемыя
прайшлі перыяд станаўлення ўнутрысаюзнай работы, пасту
набывалі вопыт шматбаковай дзейнасці сярод студэнцтва,
адметную ролю ў жыцці ВНУ, хоць і не былі пазбаўлены
фармалізму, «заарганізаванасці», бюракратызму.

Асаблівасцю арганізацыі прафсаюзнага жыцця ў студэн
асяроддзі ў першай палове 20-х гг. было тое, што ў ВНУ
нічалі галіновыя прафесійныя саюзы, адсутнічалі адзіныя
арганізацыі студэнтаў. Колькасць студэнтаў-членаў прафса
у канкрэтнай ВНУ вызначалася ў асноўным колькасцю за
ных студэнтаў. У першыя гады арганізацыі ВНУ ў Белар
колькасць членаў прафсаюзаў сярод студэнтаў была невялі
яны аб'ядноўвалі не ўсіх студэнтаў. Так, у 1923 г. у Віцеб
педагагічным інстытуце з 403 студэнтаў членамі прафса
з'яўляліся толькі 99 чалавек [4]. У БДУ ў гэты час арганіз
ных членаў прафсаюзаў было 1400 чалавек, што складала
40 % ад колькасці ўсіх студэнтаў [5]. У наступныя гады ко
касць членаў прафсаюзаў сярод студэнтаў павялічвалася, хоць
не хуткімі тэмпамі. У 1926/27 навучальным годзе членамі праф-
саюзаў былі 2,8 тыс., ці 63,8 % ад агульнага ліку студэнтаў [6].

Студэнты, члены прафсаюзаў, паступіўшыя ў ВНУ, захоўва
членства ў сваім прафсаюзе і ў час вучобы. Па гэтай прыкме
яны аб'ядноўваліся ў прафсекцыі, якія ўзначальвалі выбран
на агульных сходах прафкомамі навучэнцы. У ВНУ дзейніча
прафсекцыі многіх прафсаюзаў, дзе колькасць членаў пад
была невялікай. Так, у Беларускім дзяржаўным інстыту
сельскай гаспадаркі, у якім восенню 1924 г. вучыліся 543 чала-
векі, меліся секцыі чатырох прафсаюзаў: Рабзямлесу, Працасве-
ты, Саўпрацаўнікоў і Нарсувязі. У двух апошніх налічвалася 28 і
10 чалавек адпаведна. Акрамя таго, былі члены іншых праф-
саюзаў, але з-за малалікасці (колькасць кожнага не перавышала
4—5 чалавек) яны не мелі сваіх секцый [7]. К 1 студзеня 1925 г.

у інстытуце дзейнічала ўжо 6 прафсекцый. 170 чалавек налічвалася ў прафсаюзе Рабзямлесу, 189 — у Працасвеце, 35 — у прафсаюзе Саўпрацаўнікоў, 12 — у Нарсувязі, 11 — у Чыгуначнікаў, 6 — у Гарбарнікаў і 23 чалавекі іншых прафсаюзаў (усяго 346 чалавек). Кожная з прафсекцый займалася ў асноўным працай непасрэдна сярод сваіх членаў, арганізоўваючы для гэтага гуртковыя заняткі, розныя палітычныя і культурныя мерапрыемствы, шэфскую працу. Характэрна, што прыём новых членаў секцыямі амаль не праводзіўся. Папаўняліся яны ў асноўным за кошт толькі залічаных студэнтаў, членаў прафсаюзаў [8].

У Горацкім сельскагаспадарчым інстытуце на 1 ліпеня 1924 г. з 832 студэнтаў членамі прафсаюзаў з'яўляліся 425 чалавек, што складала 51 % ад агульнай колькасці навучэнцаў [9]. У той жа перыяд у БДУ дзейнічала 18 прафсекцый амаль усіх існаваўшых на той час у рэспубліцы галіновых прафсаюзаў [10].

Зразумела, што прыналежнасць да розных прафсаюзаў студэнтаў адной ВНУ патрабавала каардынацыі дзейнасці іх прафсаюзаў. Дыктавалася гэта адзінымі праблемамі і задачамі, вырашаць якія былі прызваны прафесійныя арганізацыі ў маштабе навучальнай установы. Менавіта таму з восені 1923 г. у іх пачалося стварэнне Выканаўчых бюро прафсекцый (Выканбюро), якія з'яўляліся вышэйшым органам прафсаюзных арганізацый, выбіраліся на агульных сходах усіх студэнтаў, членаў прафсаюзаў. У складзе Выканбюро існавалі культаддзел, эканомаддзел, медсэмсекцыя, каса ўзаемадапамогі, якія кіравалі адпаведнай работай. Выканбюро арганізоўваліся ва ўсіх ВНУ.

Працэс структурнай рэарганізацыі прафсаюзнага жыцця ВНУ завяршыўся ў канцы 1923 г. правядзеннем Рэспубліканскай канферэнцыі прафсаюзных арганізацый студэнтаў ВНУ і тэхнікумаў. Узмоцнены ўплыў кампартыі праявіўся ў наданні пэўнай палітычнай афарбоўкі прафсаюзнаму руху ў ВНУ. Было вырашана стварыць адзіны кіраўнічы орган Бюро пралетарскага студэнцтва пры Цэнтральным Савеце прафсаюзаў Беларусі (Белбюро Пралетстуда), рэарганізаванае ў 1926 г. у Цэнтральнае бюро Пралетстуда БССР (ЦБ ПС). Пленум выбіраў Прэзідыум гэтага органа (як правіла, 3 чалавекі), штатны апарат якога складаўся з аднаго платнага работніка, які атрымоўваў зарплату за кошт ЦСПСБ і тэхнічнага сакратара, аплачваемага з унутраных сродкаў.

Рэспубліканскія канферэнцыі Пралетстуда БССР збіраліся штогод. У перыяд паміж імі праходзілі пленумы і пасяджэнні ЦБ, яго Прэзідыума. Як правіла, на іх абмяркоўваліся пытанні, якія тычыліся ўсіх ці большасці прафсаюзных студэнцкіх арганізацый і мелі падчас палітычнае значэнне.

У красавіку 1924 г. адбылася нечарговая Усебеларуская канферэнцыя пралетарскага студэнцтва Беларусі, скліканне якой

абумоўлівалася пашырэннем тэрыторыі рэспублікі і ўклю… у склад арганізацыі студэнтаў новых навучальных устан… працягу гэтага года на пасяджэннях Белбюро Пралетсту… разгледжаны пытанні аб правядзенні кампаніі дапамогі ст… ву БССР, аб культасветрабоце студэнтаў, што ад'язджа… канікулы, святкаванні 1 Мая і 7 Лістапада, жыллёвых … студэнтаў, стварэнні студэнцкага клуба і інш. [11, л. 7, 1… 17, 33, 38]. Да правядзення III Усебеларускай канферэнц… летарскага прафарганізаванага студэнцтва (7—10 кра… 1925 г.) адбыліся 32 пасяджэнні Белбюро, на якіх разгл… 349 пытанняў, прыняты 24 цыркуляры [12, л. 25]. Тое, што… ца гэтага органа студэнцкага прафсаюзнага руху набыва… больш бюракратычны характар, падкрэслівалася і ў справ… абследавання дзейнасці ЦБ Пралетстуда, праведзенага … 1926 г. па даручэнні ЦСПСБ [13].

Пры стварэнні Пралетстуда ставілася пытанне аб арга… яго органа друку, што ва ўмовах фінансавых цяжкасця… складана. Пытанне аб гэтым разглядалася нават на пася… Сакратарыята ЦК КП(б)Б 5 лістапада 1924 г., дзе было пры… неабходным выданне штомесячнага органа Белбюро Прале… і Цэнтральнага ўпраўлення беларускага зямляцтва г. М… адпускаць на гэтыя мэты па каштарысе Саўнаркома 300 р. … каштарысе ЦК КП(б)Б 200 р. штомесяц. Рашэнне аб вод… сродкаў у памеры 300 р. кожны месяц на выданне часопіса … афармлена пастановай Распарадчага пасяджэння СНК Б… 5 лістапада 1924 г. (пратакол № 32) [11, л. 32].

У канцы лютага 1925 г. выйшаў першы нумар ча… «Чырвоны сцяг». Аб'ём складаў 4 друкаваныя аркушы, тыра… — 3 тыс. экз., цана — 30 к. Аднак часопіс распаўсюджваўся м… на, нягледзячы на яго невысокую цану. За месяц раскупілі … 1200 экз. Нават пры поўнай распрадажы нумара пакрыва… толькі каля паловы выдаткаў. У гэтай сувязі было прынята … шэнне скараціць тыраж наступнага нумара да 2 тыс. экз… колькі яго выданне поўнасцю залежала ад выдзяляемых суб… а павышаць цану на яго не мела сэнсу [12, л. 25 адв.]. На вы… на працягу года 7 нумароў часопіса было расходавана 1800 р… атрыманых ад Выдавецкага аддзела ЦК КП(б)Б, 2700 р.— ад С… наркома і 150 р.— ад Наркамата асветы [14, л. 9]. Часопіс вы… ваўся на беларускай мове. На яго старонках друкаваліся ар… кулы па палітыцы, эканоміцы, навуковыя, літаратурныя, … тычыліся быту, жыцця, вучобы студэнцтва, а таксама працы ст… дэнцкіх арганізацый. Вакол часопіса аб'ядноўвалася каля 40 ст… дэнтаў-карэспандэнтаў, мелася літаратурная студыя, якая скл… далася з групы прыкладна ў 30 чалавек студэнтаў-па… і пісьменнікаў, у асноўным членаў аб'яднання «Маладня…

...ак у канцы года ў сувязі з адсутнасцю фінансавання выданне ...пiса было спынена [15].

Завяршэнне працэсу фарміравання структуры прафсаюзных ...наў у ВНУ адбылося ў канцы 1926 г. Цэнтральнае Бюро ...летстуда аб'ядноўвала 2 Выканбюро прафсекцый (у БДУ і Ві...бскім ветэрынарным інстытуце), 22 прафкомы, што дзейнічалі ... факультэтах, рабфаках і ў тэхнікумах. У БДУ налічвалася ...26 членаў прафсаюзаў, у Беларускай сельскагаспадарчай ...эміі — 1300, у Віцебскім ветэрынарным інстытуце — 70, ...ымВНУ — 300, на трох рабфаках — 282 [14, л. 7]. Сфарміра...лася шырокае кола прафсаюзнага актыву, занятага на выбар... пасадах у розных органах прафсаюзнага руху. Так, ...925/26 навучальным годзе ў БДУ і Выканбюро ўваходзіла ...алавек, у прафкомы факультэтаў — 51, у бюро галіновых ...фсаюзаў — 26, у касе ўзаемадапамогі працавала 10 чалавек. ...о, такім чынам, у 1925/26 навучальным годзе прафактыў ...даў 96, а ў 1926/27 — 100 чалавек [16, л. 58—59].

У цесным кантакце з прафсаюзнай арганізацыяй і пад кіраў...вам яе органа — Выканбюро — у ВНУ працавалі іншыя ...адскія арганізацыі. У БДУ гэта былі краязнаўчае таварыст... МОПР, АСАВІЯХІМ, НАП, радыё-, лектарскія і спартыўныя ...ктывы, у органах кіраўніцтва якіх у 1925 г. было 53 чалаве... у 1926/27 навучальным годзе — больш за 80 [16, л. 56—57]. ... універсітэце ў 1928 г. дзейнічала каля 20 такіх грамадскіх ...анізацый, у т. л. у дабрачынным абарончым таварыстве ...ымала ўдзел каля 350 чалавек, у арганізацыі «Прэч непісьмен...ць» — больш за 210, у краязнаўчым таварыстве — 125, ...амі МОПРа з'яўляліся каля 300 чалавек [17, л. 25—26].

Стварэнне і існаванне такіх грамадскіх арганізацый, далучэн...да іх працы значнай колькасці студэнтаў у большасці выпад... (МОПР, АСАВІЯХІМ) ініцыіраваліся партыйнымі і дзяржаў...ымі органамі, з'яўляліся абавязковымі і падчас фармальнымі ... студэнтаў. Больш вольнымі ад «заарганізаванасці» былі ...ыя гурткі (краязнаўчыя, мастацкія, спартыўныя, літаратур...), якія абапіраліся на сапраўдную зацікаўленасць студэнтаў. ...аміты беларускі гісторык М. М. Улашчык успамінаў, як, ...чы студэнтам БДУ, у пачатку снежня 1924 г. разам ... Чарнушэвічам, М. Адзярыхам, С. Шутавым і іншымі ён ...рыў па ўласнай ініцыятыве універсітэцкі краязнаўчы гурток. ...ка наладзілася сувязь з Выканбюро універсітэта, на базе ...ка ў выніку было створана Краязнаўчае таварыства універсі...та на чале з рэктарам У. І. Пічэтам, разгарнулася праца па ...учэнні розных гурткоў Беларусі [18]. Праца ў такіх гуртках ...огім абапіралася на ініцыятыву і дабрачынны ўдзел у іх сту...таў, якія імкнуліся больш поўна рэалізаваць сваю грамад...

скую актыўнасць, цесна звязаць яе са сваёй будучай праф
далучыцца да навуковай дзейнасці.

У планах, справаздачах і пастановах, якія прымаліся ў
чыненні да працы прафарганізацый ВНУ, нязменна ўпамі
аб акадэмічнай рабоце як важным напрамку іх дзейнасці. Пр
метна расце ўвага да пытанняў акадэмічнай паспяховасці ў
дзіне 20-х гг., калі высветліліся негатыўныя вынікі існав
сістэмы адбору ў лік студэнтаў, што адзначалі дзяржаўныя
ны і адміністрацыя ВНУ. Варта прызнаць, што самастойная
прафсаюзных арганізацый у павышэнні акадэмічнай паспях
была невялікай. Яна зводзілася да ўдзелу іх прадстаўні
Прадметных камісіях, разнастайных камісіях па праверцы
ву студэнтаў, арганізацыі абмеркавання пытанняў вучобы ў
дэнцкіх групах, канстатацыі меўшых месца недахопаў, пад
цы тых ці іншых мер па іх выпраўленні, але гэтыя дзея
ўтрымоўвалі ніякіх самастойных ініцыятыў, а падчас і дзей
прапаноў. У саміх студэнцкіх арганізацыях, як прызнал
Пралетстуда ў 1927 г., амаль ніякай акадэмічнай працы
вялося і большую частку т. зв. акадэмічных камісій т
стварылі [17, л. 35].

Разнастайнай і самастойнай была культурна-масавая раб
якая арганізоўвалася прафсаюзнымі арганізацыямі. Акрамя
званых гурткоў, розных па змесце і накіраванасці, прафкомы
зам з іншымі органамі ВНУ выдавалі насценныя газеты. У
ў навучальных установах у 1927 г. выдавалася 37 насцен
газет і 2 рукапісныя часопісы, налічвалася 11 студкораўскіх г
коў. Пасля спынення выпуску часопіса ЦБ Пралетстуда найб
прыметным органам друку студэнцтва стаў часопіс Выкан
Пралетстуда БДУ «Шлях студэнцтва», які выходзіў у 19
1928 гг. На яго старонках змяшчаліся матэрыялы, якія асв
лі разнастайныя бакі студэнцкага жыцця. У працы рэдка
насценгазет і часопіса ўдзельнічала каля 400 студэнтаў. Ра
з тым слаба прадстаўлялася вытворчая тэматыка, знешні выгл
пісьменнасць насценгазет знаходзіліся не на высокім узроўні [1

З дапамогай адміністрацыі і прафсаюзных арганізацый
ўсіх ВНУ у вучэбных карпусах і інтэрнатах былі арганізава
«чырвоныя куткі», чытальні, бібліятэкі, існавалі гурткі па
асветы, праводзіліся вечары адпачынку, дыспуты, культпах
ў тэатры і кінатэатры, разгортвалася экскурсійная праца.

З другой паловы 1920-х гг. вышэйшыя навучальныя ўс
новы пачынаюць ярка адлюстроўваць палітычныя і ідэалагіч
працэсы, якія адбыліся ў той час у дзяржаве. У барацьбу з ус
што не ўкладвалася ў рамкі камуністычнай ідэалогіі, аказал
ўцягнутымі і прафесійныя арганізацыі, якія імкнуліся не а
стаць ад партыйных. Прычым аб'ектам гэтай барацьбы падч

[...]ціяваліся з'явы зусім нечаканыя, пад якія штучна падводзіліся [...]думаныя ідэалагічныя абвінавачванні. Так, у верасні 1929 г. [П]рэзідыум Цэнтральнага Бюро Пралетстуда асобным пунктам на [па]сяджэнні заслухаў пытанне «О ношении студэнтами формы». [У] прынятай пастанове канстатавалася: «...небольшая часть студентов до этого времени носит студенческую форму (фуражки), [что] является плохой традицией старой дореволюционной школы — отличает пролетарское студенчество от трудящихся. Президиум ЦБ ПС считает это положение недопустимым и недостойным пролетарского студенчества и предлагает всем студенческим организациям вести борьбу с ношением формы; добившись ее полного уничтожения» [20].

На медыцынскім факультэце БДУ пры падвядзенні вынікаў [са]спаборніцтва паміж курсамі, акрамя такіх паказчыкаў, як [ко]лькасць студэнтаў, занятых у гуртках, членаў грамадскіх арганізацый і г. д., значыўся пункт «Выяўленне непрыхільных [эл]ементаў і барацьба з варожай ідэалогіяй», па якім таксама [ац]эньвалася праца акадэмічных груп [21].

Такім чынам, к канцу 20-х гг. грамадскае жыццё студэнцтва [Б]ДУ зводзілася да дзеяння вузкага кола грамадскіх арганізацый, [ка]нтраляюмых і кіруемых кампартыяй. Гэта прыметна звужала [ма]гчымасці праяўлення грамадскай і палітычнай актыўнасці студэнцкай моладзі. Фактычна ўся яе грамадская дзейнасць аб[ме]жоўвалася ўхваленнем палітыкі кампартыі, усялякія праявы [ула]снай пазіцыі і ініцыятывы ў студэнцкім асяроддзі выкараня[лі]ся з прымяненнем самых жорсткіх мер.

*Крыніцы, літаратура*


1. НА РБ, ф. 205, воп. 1, спр. 1, л. 19.
2. НА РБ, ф. 205, воп. 1, спр. 12, л. 19.
3. НА РБ, ф. 42, воп 1, спр. 211, л. 207—210.
4. НА РБ, ф. 42, воп. 1, спр. 1446, л. 10.
5. НА РБ, ф. 42, воп. 1, спр. 213, л. 222 адв.
6. НА РБ, ф. 42, воп. 1, спр. 1707, л. 6.
7. НА РБ, ф. 42, воп. 1, спр. 93, л. 62.
8. НА РБ, ф. 42, воп. 1, спр. 1541, л. 319.
9. НА РБ, ф. 42, воп. 1, спр. 1214, л. 130.
10. НА РБ, ф. 42, воп. 1, спр. 1368, л. 130.
11. НА РБ, ф. 42, воп. 1, спр. 1248.
12. НА РБ, ф. 4-п, воп. 7, спр. 48.
13. НА РБ, ф. 42, воп. 1, спр. 1845, л. 95.
14. НА РБ, ф. 268, воп. 1, спр. 4.
15. НА РБ, ф. 4-п, воп. 7, спр. 66, л. 86.
16. НА РБ, ф. 268, воп. 1, спр. 7.
17. НА РБ, ф. 268, воп. 1, спр. 58.
18. *Улашчык М.* Нататкі пра бадзяньні ў 1924—1929 гады // Маладосць. 1999. № 11. С. 180—214.